Што злучае Фаціму з Фаустынай Кавальскай?

Аўтар: кс. Юрый Марціновіч
01.10.2017 00:00

Да 100-годдзя аб'яўленняў Маці Божай у Фаціме



Фацімскае аб’яўленне і аб’яўленне Божай міласэрнасці маюць шмат супольных рыс. Прыгадваюць, што адзіным ратункам з’яўляецца рэанімацыя веруючага сэрца. Сутнасць абодвух аб’яўленняў – скіраваны да людзей заклік, каб паклапаціліся аб збаўленні сваім і цэлага свету. Бо чалавек, адварочваючыся ад Стварыцеля, набліжаецца да катастрофы, скіроўваючы самога сябе на асуджэнне. “Скажы збалеламу чалавецтву, няхай прытуліцца да Майго міласэрнага сэрца, а Я напоўню яго спакоем”, – гаворыць Езус с. Фаустыне. “Сэрцы Езуса і Марыі хочуць праз вас аказаць свету веліч міласэрнасці”, – кажа Анёл дзецям з Фацімы. У абодвух пасланнях бачым заклік, каб свет звярнуўся да Бога. Ратунак – у адкрыцці сэрца наноў. І фацімскае пасланне, і “Дзённік” с. Фаустыны – гэта зварот да людзей, каб у Сэрцы Езуса і Сэрцы Марыі адшукалі самы дасканалы ўзор і ў той жа час сілу да абавязковай перамены, да навяртання.

Як пастушкі, так і манахіня мелі бачанне пекла. Св. Фаустына ў “Дзённіку” запісвае: “Сёння я была ў глыбінях пекла, заведзеная туды Анёлам”, – пасля чаго пералічвае, у чым заключаюцца пякельныя мукі. Усё апісанне заканчвае словамі: “Пішу аб гэтым згодна з Божым наказам, каб ніводная душа не сцвярджала, што пекла няма, альбо што ніхто там не быў і не ведае, як у ім. Я, сястра Фаустына, па Божым загадзе была ў бездані пекла для таго, каб расказваць душам і сведчыць, што пекла існуе”. Яе асабістым адказам на гэтае бачанне было павелічэнне стараннасці: “Калі я апамяталася, не магла супакоіцца ад спалоху, як страшна там пакутуюць душы. Таму яшчэ больш горача малюся аб навяртанні грэшнікаў, пастаянна прашу Божай міласэрнасці для іх”. † На старонках “Дзённіка” манахіня шматразова паўтарае, што прагне ратаваць канаючыя душы, якія знаходзяцца над бездданню, бо не паядналіся з Усемагутным. Піша: “Ужо перад самай пагібеллю міласэрны Бог дае душы тое яснае ўнутранае імгненне, што, калі хоча, яна мае магчымасць вярнуцца да Бога”. І дадае: “Але няраз душы настолькі ўпартыя, што свядома выбіраюць пекла; робяць дарэмнымі ўсе малітвы, якія іншыя душы ўзносяць за іх да Пана, і нават усе Божыя намаганні”.

Фацімскія дзеці ўбачылі пекла 13 ліпеня 1917 года.

Аўтар: кс. Юрый Марціновіч
01.10.2017 00:00

З успамінаў: “Здавалася, што бляск пранікае праз зямлю, і мы ўбачылі нібы мора агню. У гэтым агні былі паглынуты дэманы і душы, як празрыстыя распаленыя да чырвані вуглі, чорныя ці карычневыя, падобныя да людзей, захопленыя пажарышчам, узнесеныя полымем, якое выпаўзае з іх саміх разам з клубамі дыму, што валяць ва ўсе бакі...”. Дзеці моцна спалохаліся. Але страх хутка змяніўся гарачым жаданнем ратаваць душы ад асуджэння. Пастушкі, як і с. Фаустына, прагнулі пакутаваць, прымаць цярпенні, у пэўным сэнсе браць на сябе кару за грахі іншых, каб ратаваць іх ад пекла.

Як пастушкі з Фацімы, так і св. Фаустына паходзілі з бедных сялянскіх сем’яў. Што п

Пасля таго, як Марыя паказала дзецям з Фацімы пекла, навучыла іх малітве, якую да сёння прамаўляем пасля кожнай таямніцы ружанца: “О, мой Езу, прабач нам грахі нашыя, захавай нас ад агню пякельнага, прывядзі ўсе душы на неба і дапамажы асабліва тым, каму найбольш патрэбна Твая міласэрнасць”. Гэта, па сутнасці, малітва аб Божай міласэрнасці. Яна з’яўляецца даверлівым далучэннем да жадання Стварыцеля, каб усе душы трапілі ў Неба.

Так на пачатку XX стагоддзя з Партугаліі і Польшчы – 2-юх супрацьлеглых старон Еўропы – плыло тое самае пасланне Божай міласэрнай любові. З аднаго боку Езус указваў на сваё Сэрца як крыніцу сакрамантаў, а з іншага – Марыя скіроўвала позірк на сваё Беззаганнае Сэрца як прыклад абсалютнага з’яднання з Богам, з Хрыстом.